# СУЧАСНЫЯ ФОРМЫ РАБОТЫ З ВЫСОКАМАТЫВАВАНЫМІ І АДОРАНЫМІ ВУЧНЯМІ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Арцямёнак Антон Генадзевіч*

***Анатацыя.*** *У артыкуле разглядаюцца асноўныя формы працы з адоранымі і высокаматываванымі вучнямі па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура". Прапануюцца прыёмы работы з высокаматываванымі вучнямі з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій. Асвятляюцца пытанні творчага ўзаемадзеяння настаўнік-вучань, а таксама ўплыў дыстанцыйнага навучання на развіццё і фарміраванне творчых уменняў вучняў.*

Мова фарміруе ў чалавека асобу, яднае ўсіх нас у адзін народ, служыць неабходным падмуркам для развіцця нацыянальнай культуры. "Як важнейшы элемент культуры яна з'яўляецца неад'емным атрыбутам народа, які вызначае прыналежнасць да яго любога чалавека, і такім чынам выступае як магутны фактар фарміравання нацыянальнай самасвядомасці" [2, с. 6]. Развіццё маўленчых здольнасцяў прывіваецца чалавеку ад самага нараджэння і напрацягу жыцця шліфуецца і ўдасканальваецца. "Няма чалавека, які б не карыстаўся мовай. Мова ў большай ці меншай ступені цікавіць усіх, адных — як унікальны сродак узаемадачыненняў паміж людзьмі, другіх — як сродак выхавання, трэціх — як сродак далучэння да спадчыннай культуры народа" [10, с.3].

У артыкуле разглядаюцца асноўныя кірункі стварэння сістэмы працы з адоранымі і высокаматываванымі вучнямі па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура". Назапашаны вопыт можа спатрэбіцца настаўнікам беларускай мовы і літаратуры для выкарыстання ва ўрочнай і пазаўрочнай дзейнасці.

Сярод самых цікавых і загадкавых з'яў прыроды дзіцячая адоранасць традыцыйна займае адно з вядучых месцаў. Праблемы яе дыягностыкі і развіцця хвалююць педагогаў цягам многіх стагоддзяў. Цікавасць да дзіцячай адоранасці ў цяперашні час вельмі высокая, што лёгка можа быць растлумачана грамадскімі патрэбамі. Патрэбы агульнаадукацыйнай школы, развіццё вышэйшай адукацыі, культурнага і грамадскага жыцця рэспублікі – усё гэта вымагае педагогаў выкарыстоўваць адукацыйныя інавацыі, знаходзіць і выяўляць адораных вучняў, далучаць іх да беларускага слова. Навучанне і выхаванне адораных і высокаматываваных дзяцей з'яўляецца важным кірункам у сучаснай адукацыйнай палітыцы. Менавіта адораныя вуічні папаўняюць нацыянальную эліту нашай дзяржавы і щ будучым паспрыяюць эканамічнаму і культурнаму развіццю краіны.

У педагагічным працэсе развіццё адоранага вучня мэтазгодна разглядаць як развіццё яго ўнутранага дзейнаснага патэнцыялу. Здольнасці быць аўтарам, творцам, актыўным стваральнікам свайго жыцця з'яўляюцца запатрабаванымі на ўсіх этапах станаўлення асобы. Як і ўменні ставіць мэту, шукаць спосабы яе дасягнення, быць здольным да свабоднага выбару і быць адказным за яго, максімальна выкарыстоўваць свае магчымасці, спрабуючы выйсці за іх межы. Каб рэалізаваць зададзеныя кірункі на практыцы, неабходны сістэмны падыход да навучання адораных вучняў, своечасовая дыягностыка іх здольнасцей, адпаведнае праграмнае забеспячэнне, распрацоўка заданняў больш высокага мысленчага ўзроўню, а таксама прафесіяналізм настаўніка, здольнага працаваць з адоранымі вучнямі.

Трэба памятаць, што якім бы не быў адораным і таленавітым вучань, яго патрэбна вучыць. Важна прывучыць да ўседлівасці, развіваць уменні самастойна працаваць, прывіваць самастойнасць у прыняцці рашэнняў. Неабходна адпаведная "загрузка": з дашкольнага ўзросту вучні павінны спасцігаць значэнне новых для сябе ведаў і адкрыццяў праз творчасць і адукацыю. Разам з тым адораны вучань не пацерпіць ціску або некарэктных заўваг.

Для развіцця сваіх талентаў адораныя дзеці павінны свабодна размяркоўваць свой час і прастору, вучыцца па пашыраным плане і адчуваць індывідуальны клопат і ўвагу з боку свайго настаўніка. Акцэнт робіцца не на тым, што вывучаць, а на тым, як вывучаць. Калі адоранаму вучню даецца магчымасць не спяшацца з выкананнем задачы, то ён найлепшым чынам спасцігне таямніцу сувязі паміж з'явамі і навучыцца прымяняць свае адкрыцці на практыцы. Неабмежаваныя магчымасці аналізаваць, уменне глыбока ўнікаць у існасць праблемы спрыяюць праяўленню прыроднай дапытлівасці і цікавасці, развіццю аналітычнага і крытычнага мыслення.

Адной з асноўных задач сучаснай школы з'яўляецца падрыхтоўка чалавека, здольнага самастойна прымаць рашэнні і эфектыўна дзейнічаць у сучасным свеце. Кожны вучань па-свойму таленавіты, патрэбна яго толькі падтрымаць у пэўны момант, дапамагчы раскрыццю яго таленту. Развіваць творчыя здольнасці — значыць ствараць умовы для разумення вучнямі неабходнасці і магчымасці атрымання новых ведаў, умення ставіць вучэбную задачу, шукаць спосаб дзеяння і шляхі яе рашэння. Галоўная задача настаўніка — арганізаваць вучэбна-выхаваўчы працэс такім чынам, каб вучань адчуваў сябе першаадкрывальнікам, даследчыкам, аналітыкам, каб тыя задаткі, якія ён мае, былі рэалізаваны ў адпаведных здольнасцях як мага паўней. Дзецям уласціва патрэба ў разумовых уражаннях, якая выяўляецца ў схільнасці да даследавання і эксперыментавання. Пры гэтым неабходна ўлічваць здольнасці, узроставы патэнцыял вучняў, а таксама патрабаванні сучасных нарматыўных і зака-

надаўчых дакументаў. Так, "... прыняцце Закона Рэспублікі Беларусь "Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі" забяспечыла захаванне адзінага моўнага рэжыму ў навучанні, адзінства друкаваных беларускамоўных выданняў, наогул далейшую жыццядзейнасць беларускай літаратурнай мовы ў новым тысячагоддзі як адной з дзяржаўных моў" [2, с.13]. На аснове Закона ад 23 ліпеня 2008 г. сучаснымі беларускімі даследчыкамі-філолагамі створаны і адпаведныя дапаможнікі з абагульненнем вопыту правядзення алімпіяд і распрацооўкі творчых заданняў па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура". Напрыклад, вучэбны дапаможнік У.І. Куліковіча "Сучасная беларуская арфаграфія. Правілы. Трэніровачныя заданні. Кантрольныя работы. Заліковыя тэсты. Даведкі [3]; зборнік алімпіядных матэрыялаў пад рэдакцыяй Г.А. Арцямёнка "Алімпіяды па беларускай мове і літаратуры: Комплексная работа" [1] і іншыя.

Сучасная сістэма працы з адоранымі вучнямі ў асноўным сваім рэчышчы накіравана на правядзенне дыстанцыйных алімпіяд і творчых інтэлектуальных конкурсаў, спалучаючы ў сабе традыцыйныя формы работы і магчымасці інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Алімпіяды і конкурсы па беларускай мове і літаратуры праводзяцца штогод. Многія з іх на сённяшні дзень ужо сталі традыцыйнымі. Вопыт правядзення падобных мерапрыемстваў за апошнія гады адпаведна назапашваецца і абагульняецца. На яго аснове ствараюцца навукова-метадычныя рэкамендацыі, якія дапамогуць вучням і настаўнікам пры аналізе заданняў, выяўленні іх сутнасці, зарыентуюць іх у выбары алгарытмаў рашэння алімпіядных заданняў. Матэрыялы дыстанцыйных алімпіяд маюць практыка-арыентаваны характар, а таму могуць быць выкарыстаны як дадатковы матэрыял на занятках па беларускай мове і беларускай літаратуры.

Разгледзім асноўныя этапы арганізацыі і правядзення дыстанцыйных абласных алімпіяд.

Асноўнай мэтай алімпіяд з'яўляецца развіццё і падтрымка цікавасці да навучання, павышэнне ўзроўню ведаў і ўменняў высокаматываваных вучняў, фарміраванне навыкаў самакантролю. Шматлікія філалагічныя задачы, віктарыны і конкурсы прысвечаны дзяржаўным і культурным дзеячам Беларусі, пісьменнікам, паэтам, мовазнаўцам, разгляду твораў мастацкай літаратуры і літаратурных герояў і іншым філалагічным пытанням. Заданні для алімпіяд прадугледжваюць працу як з праграмным матэрыялам базавага ўзроўню, так і матэрыял павышанай складанасці. Пры іх выкананні вучні могуць выяўляць свае здольнасці да класіфікацыі, абагульнення і прагназавання вынікаў, падключаць інтуіцыю і ўяўленне.

Арганізацыя алімпіяды ўключае ў сябе некалькі этапаў:

1. Вызначэнне тэрмінаў правядзення алімпіяды (дата і час);

2. Распрацоўка палажэння, адбор і размяшчэнне заданняў на рэсурсе (давядзенне адпаведнай інфармацыі да ўдзельнікаў);

3. Правядзенне алімпіяды (алімпіяда праводзіцца ў строга адведзеныя тэрміны);

4. Падвядзенне вынікаў.

Адказы ўдзельнікаў правяраюцца або аўтаматычна, або з выкарыстаннем ручной праверкі, далей складаецца рэйтынг удзельнікаў і вызначаюцца пераможцы. У цяперашні час для ўзнагароджвання ўдзельнікаў дыстанцыйных алімпіяд шырока выкарыстоўваюцца электронныя дыпломы і сертыфікаты. Яны рассылаюцца пераможцам па электроннай пошце і выкладаюцца на сайце. Кожны жадаючы можа раздрукаваць свой дыплом самастойна. Змест, каляровае афармленне дыплома можа вар'іравацца для кожнай алімпіяды.

Усе дыстанцыйныя алімпіяды для вучняў праводзяцца ў некалькі тураў, заданні кожнага наступнага тура ўскладняюцца. Гэта дазваляе выявіць найбольш моцных вучняў і надалей працягнуць з імі планамерную і мэтанакіраваную работу. Для правядзення такіх алімпіяд неабходны выхад у сеціва (інтэрнэт), камп'ютар, планшэт або мабільны тэлефон.

Заданні дыстанцыйных конкурсаў размяшчаюцца пры дапамозе дадаткаў Google, а менавіта ў сервісе "формы". Google-формы пабудаваны такім чынам, што ў іх даволі лёгка стварыць разгалінаваную структуру, дзе можна ў першым раздзеле прыняць рэгістрацыю ўдзельніка, а ў другім размясціць заданні розных




Малюнак 1. — Абласная дыстанцыйная алімпіяда для вучняў VII класаў




Малюнак 2. – Абласная дыстанцыйная алімпіяда для вучняў V–VI класаў у гонар Арцямёнка Генадзя Антонавіча

тыпаў. Таксама падобная структура дазваляе вучням выконваць заданні на любых даступных камп'ютарных сродках: персанальныя камп'ютары, мабільныя тэлефоны, планшэты. Па заканчэнні адведзенага на выкананне заданняў часу, форма зачыняецца, што не дазваляе вучням выконваць заданні паўторна, бо дыстанцыйныя конкурсныя формы прадугледжваюць найперш аднаразовае і самастойнае выкананне.

Разгледзім некаторыя прыклады заданняў у арыгінальным афармленні і прывядзём статыстычныя паказчыкі абласных дыстанцыйных алімпіяд.

У I этапе абласной дыстанцыйнай алімпіяды для вучняў VII класаў прынялі ўдзел 758 удзельнікаў, што з'яўляецца найбольшым паказчыкам сярод устаноў агульнай сярэдняй адукацыі Першамайскага раёна г. Віцебска (Малюнак 1).

У II этап былі адабраныя 200 вучняў з найлепшымі баламі па выніках першага этапу. Пры гэтым выключаліся з конкурсу вучні, якія адпраўлялі заданні з адной установы адукацыі абсалютна адначасова. Такім чынам выключаліся аднолькавыя адказы пад рознымі імёнамі. Звычайна тэставыя заданні правяраюцца платформай аўтаматычна, а творчыя – непасрэдна метадыстам-арганізатарам конкурсу. Таму спісванне або несумленны падыход да выканання заданняў адсочваецца і ў далейшым такія ўдзельнікі выключаюцца з дыстанцыйнай алімпіяды.

У абласной дыстанцыйнай алімпіядзе для вучняў V–VI класаў у навучальным годзе 2022/2023 прынялі ўдзел вучняў, у лідарах Першамайскі, Аршанскі і Кастрычніцкі раёны (Малюнак 2). Дадзеная алімпіяда праводзіцца штогод у адзін тур. Пераможцы атрымліваюць памятныя сертыфікаты.

На ілюстрацыі паказаны прыклады тэставых заданняў, дзе камп'ютар адразу сістэматызуе правільныя і памылковыя адказы ў працэнтных суадносінах (Малюнак 3). Адзначым, што падобная статыстыка даступна толькі арганізатарам – стваральнікам конкурсу. Па завяршэнні выканання заданняў і іх адпраўкі вучань не бачыць правільныя і памылковыя адказы. Гэта зроблена з прычыны аб'ектыўнага і сумленнага падыходу да падвядзення вынікаў па аналогіі з этапамі рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура".




Малюнак 4. – Размеркаванне балаў пасля аўтаматычнай праверкі заданняў дыстанцыйнай алімпіяды




Малюнак 3.– Прыклады тэставых заданняў дыстанцыйных алімпіяд

Канчатковы падлік балаў тэставых заданняў ажыццяўляецца непасрэдна на самой платформе google-формы (Малюнак 4). Пры навядзенні курсора на рысу дыяграмы можна ўбачыць канкрэтную колькасць балаў і колькасць вучняў, каторыя дасягнулі адпаведнага ўзроўню.

У сістэме распрацаваных заданняў любой дыстанцыйнай алімпіяды, важнае месца належыць заданням з творчым ухілам адкрытага тыпу, праверка якіх выконваецца ў ручным рэжыме. Менавіта падобныя практыкаванні дапамагаюць вызначыць і ацаніць канчатковую падрыхтаванасць вучняў (Малюнак 5).

Так, на пытанне "Што варта чытаць сучаснай моладзі?" некаторыя вучні даюць аднатыпны аднаслоўны адказ – "кнігі". Зразумела, што падобны адказ не патрабуе ад саміх навучэнцаў дадатковых разумовых намаганняў, адпаведна не раскрывае іх творчы патэнцыял. Аднак, ёсць і падрабязныя адказы, якія ацэньваюцца згодна з загадзя прадуманымі крытэрыямі. Сума балаў за заданні "адкрытага тыпу" дадаецца да сумы за тэставыя заданні, агульны бал прадстаўляецца як канчатковыя вынікі. Такім чынам, практыкаванні творчага характару дапамагаюць аб'ектыўна ацаніць і выявіць матываваных і адораных вучняў, раскрыць іх узровень іх камунікатыўных уменняў праз удзел ва ўсіх апісаных этапах конкурсу, у тым ліку, на заключным – вочным этапе.

Такім чынам, сёння з упэўненасцю можна сказаць, што дыстанцыйныя алімпіяды, конкурсы работ даследчага характару аказваюць істотную дапамогу ў выяўленні адораных вучняў. Адукацыйнаму працэсу надаецца даследчы, творчы характар, вучням прадстаўляецца магчымасць выяўляць ініцыятыву ў працэсе пазнавальнай дзейнасці. Яшчэ Францыск Скарына сцвярджаў, што "...не толькі жыве чалавек хлебам або лекамі, але найбольш усялякім словам..." [7, с.7]. Галоўнай мэтай падобных конкурсаў з'яўляецца паглыбленне і ўдасканаленне ведаў па мове і літаратуры, паўтор і замацаванне пэўных тэм, папярэджанне і выпраўленне арфаграфічных памылак, узбагачэнне

**27. Напішыце міні-сачыненне на тэму "Што варта чытаць сучаснай моладзі?".**

2 390 ответов

Кнігі

кнігі

Як жыць? Хто я? У чым сэнс жыцця? Ва ўсе часы моладзь задавалася шэрагам пытанняў, адназначных і агульных адказаў на якія яшчэ не атрымалася даць ні аднаму пакаленню.

Усе мы нараджаемся з розным «стартавым капіталам». Чыесьці бацькі могуць забяспечваць сваё дзіця ўсё жыццё, а ў каго-то і на ежу не заўсёды хапае. Але, як бы ні складвалася лёс хлопца ці дзяўчыны, праблемы, увогуле-то, ва ўсіх прыкладна адны і тыя ж.

Узяць, напрыклад, адвечную тэму непадзеленага кахання. Рэдка можна сустрэць чалавека, які гэтым не «болел9raquo ;. Кожны перажывае гэтую сваю першую трагедыю па сваім — хто лягчэй, хто цяжэй. Але ў канчатковым выніку большасць маладых людзей не зацыкляецца на няўдачы і працягвае ісці па жыцці з усмешкай на твары. Не спрачаюся, для некаторых усё гэта нейкі час выглядае як трагедыя, але ўсё роўна праз час яны робяць верны вывад з таго, што адбылося, і ім становіцца працей жыць далей.

Малюнак 5. – Прыклад задання адкрытага тыпу

слоўнікавага запасу, набыццё навыкаў работы з філалагічнай літаратурай (слоўнікамі, даведнікамі, навукова-папулярнымі і мастацкімі творамі, перыядычнымі выданнямі), а разам з гэтым пашырэнне кругагляду, актывізацыя разумовай дзейнасці, развіццё лагічнага і вобразнага мыслення, памяці, кемлівасці.

З дапамогаю беларускага слова вучань фарміруе і развівае свае камунікатыўныя ўменні і творчыя здольнасці, удасканальвае свае асобасныя, метапрадметныя і прадметныя кампетэнцыі, развівае ўласную дакладнасць маўлення. У сваю чаргу, дакладнасць маўлення вызначаецца праз суадносіны мыслення, маўлення і рэчаіснасці. У гэтай сувязі выкарыстанне сучасных тэхналогій стварае аптымальныя ўмовы для навучання, выхавання, развіцця і сацыялізацыі асобы. Галоўным вынікам прымянення дыстанцыйных форм работы з'яўляецца тое, што яны дапамагаюць выбудаваць сістэму, якая спрыяе развіццю пазнавальнай і пошукавай дзейнасці вучня, тым самым узбагачаючы яго адукацыйную матывацыю.

## Спіс літаратуры


1. Арцямёнак, Г.А. Алімпіяды па беларускай мове і літаратуры : Комплексная работа / Г.А. Арцямёнак [і інш.] // Мінск : Выдавецкі цэнтр БА "Конкурс", 2022. – 192 с.
2. Еўсіевіч, Н.П. Дынаміка літаратурнай нормы сучаснай беларускай мовы / Н.П. Еўсіевіч [і інш.] ; навук. рэд. В.П. Русак ; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., Філіял "Ін-т мовы і літ. імя Якуба Коласа і Янкі Купалы". – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 440 с.
3. Кулікові, У.І. Сучасная беларуская арфаграфія. Правілы. Трэніровачныя заданні. Кантрольныя работы. Заліковыя тэсты. Даведкі : вучэб. дапам. / У.І. Кулікові. – Мінск: Новое знание, 2011. – 507 с.
4. Лыч, Л.М. Беларуская нацыя і мова : Літ.-гістарыч. арт. / Л.М. Лыч. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 277 с.
5. Маракуліна, Т.М. Слоўнік арфаграфічных новаўвядзенняў беларускай мовы / Т.М. Маракуліна, І.Л. Капылоў. – Мінск : Современная школа, 2011. – 96 с.
6. Міхневіч, А.Я. Слоўка за слоўкам : алф. давед. па культуры бел. мовы для ўсіх / А.Я. Міхневіч, Л.П. Кунцэвіч, Ю.В. Назаранка. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2006. – 166 с.
7. Паўлаў, У.А. Матчына слова : Кн. пра беларус. мову. М34 / Укладанне У.А. Паўлава ; Прадм. Н.С. Гілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 335 с.
8. Саўко, У.П. Развіццё маўлення школьнікаў пры вывучэнні марфалогіі (назоўніка і прыметніка) : Дапам. для настаўнікаў. / У.П. Саўко. – Мінск : Беллітфонд, 2000. – 112 с.
9. Старычонак, В.Д. Займальная філалогія / В.Д. Старычонак. – Мінск : Выш. шк., 1998. – 254 с.
10. Шкраба, І.Р. Лінгвістычныя задачы па беларускай мове : рыхтуемся да алімпіяды і цэнтралізаванага тэсціравання / І.Р. Шкраба. – Мінск : ТэтраСістэмс, 2010. – 112 с.


*Дата поступления в редакцию: 21.07.2023*